Жыве Беларусь!

ПРУЖАНСКАЕ ВЕЧА

№ 2 Незалежная грамадска-палітычная газета Пружаншчыны лістапад 1993 г.

Дык хто ж вінаваты?

Пасля крывавых падзей у Маскве і на Беларусі актыўна абмяркоўваецца пытанне: хто вінаваты?

Безумоўна, шлях да сапраўднай дэмакратычнай дзяржавы не просты. Асабліва для Расіі, дзе парасткі дэмакратыі былі задушаны ў 1917 годзе крывавым бальшавізмам, дзе звыш сямідзесяці год гэтак званай савецкай улады душылася ўсякае іншадумства.

Сустракаючыся з людзьмі рознага грамадскага становішча, бачыш, што ў нашым грамадстве раздваенне. Адны падтрымліваюць Ельцына і яго дзеянні, іншыя гнеўна асуджаюць яго.

Дык хто ж вінаваты? Дзе тая жаданая дарога да дэмакратыі?

Многія з нас слухаюць, хто што гаворыць забываючы, хто што робіць. Толькі сляпы не бачыў, што ў Расіі крызіс дзяржаўнасці. Становішча, якое было да 21 верасня — гэта шлях да хаосу і грамадзянскай вайны. Багацьбу за ўладу, якая там адбывалася, нельга назваць дэмакратычнай. Апазіцыя да ўраду там не была апазіцыяй, а з'яўлялася варожай яму групіроўкай. У дэмакратычным грамадстве пытанне, каму ўладу мець ў краіне, вырашае народ на свабодных выбарах. У сувязі з гэтым давайце паглядзім, хто з расейскіх дзеячаў як паступае. Барыс Ельцын зварочваецца да народа — і назначаецца рэферэндум. Ён заяўляе, што калі народ яго не падтрымае, ён пакіне пасаду прэзідэнта. Гэта чэсна, гэта дэмакратычна. Хасбулатаў жа і Руцкой не хацелі рэферэндуму. Яны баяліся ісці на выбары. І толькі зразумеўшы, што рэферэндум непазбежны, імкнуліся заблытаць пытанні ў анкеце і самых выбаршчыкаў. Калі Руцкі не быў згодзен з Ельцыным і яго палітыкай, у яго быў дэмакратычны выбар: падаць у адстаўку і вылучыць сваю кандыдатуру на прэзідэнцкіх выбарах. Але Руцкі, пралезшы за плячыма Ельцына ў віца-прэзідэнты, пайшоў на закулісныя інтрыгі, імкнучыся скінуць Ельцына і стаць прэзідэнтам. Гэта подла, гэта вераломна, гэта недэмакратычна. Прыклад сумленнасці ў Расіі падаў Іван Траўкін — апанент Барыса Ельцына. Пасля рэферэндуму, калі народ падтрымаў Ельцына і яго рэформы, Траўкін складае дэпутацкія паўнамоцтвы і адыходзіць ад палітычнай дзейнасці.

І, нарэшце, пра апошнія падзеі. Барыс Ельцын аб'явіў аб перавыбарах усіх галін улады, у тым ліку і прэзідэнта. Гэта сапраўды чэсны выхад з узнікшага крызісу. Хазбулатаў з Руцкім хапаюцца за аўтаматы, праз парламент праводзяць закон аб смяротнай кары. Чаму яны баяцца свабодных выбараў? Вось адсюль і бачна, хто рваўся да ўлады. Людзі, якія гавораць аб дэмакратыі, калі гэта ім выгадна, і якія на справе рыхтуюць крывавую дыктатуру. Ну, а вакол сябе яны набралі ўсіх — і камуністаў, і фашыстаў, і проста люмпен, якія не супраць пастраляць і парабаваць. Яны паставілі Расію перад фактам пачатку грамадзянскай вайны. Зноўку, як і ў 1917 годзе, яны вырашылі ліць кроў замест дэмакратычных выбараў. Рускі народ не пайшоў за імі, бо ён ужо не верыць у прыгожую казку пра светлае будучае, дзеля якой трэба ліць кроў сваіх братоў.

У сувязі з гэтым мне хочацца сказаць: «Людзі, будзьце разважлівымі, меркуйце не па тым, што чалавек гаворыць, а па тым, што ён робіць.»

Барыс Ельцын і яго ўрад прадухілілі крывавую бойню ў Расіі. Гэта разня гатова была перакінуцца і ў Беларусь, і другія былыя рэспублікі былога Саюза. І каб яна пачалася, жадаючых пастраляць знайшлося б усюды. У выніку гэта быў бы бунт бессэнсоўны і бязлітасны.

Калі мы сапраўды хочам міру і шчасця людзям, трэба усё рашаць на чэсных і свабодных выбарах. А ўсіх, хто хоча пастраляць, трэба накіроўваць туды, куды яны хочуць пасылаць іншых.

М. ДАРАФЯЮК

Свабодны прафсаюз Беларусі

На ўздыме дэмакратычнага руху, падчас красавіцкіх страйкаў 1991 года паўстаў беларускі рабочы рух, які арганізацыйна аформіўся ў Незалежны прафсаюз і стаў уплывовай сілаю. Незалежныя прафсаюзы, што ўтварыліся на грунце страйкавых камітэтаў, выступілі супраць камуністычнай наменклатуры, за правы чалавека працы. Скончылася манаполія афіцыйных прафсаюзаў — часткі таталітарнае сістэмы.

Цяпер, калі ў нашай рэспубліцы адсутнічае дзяржаўная праграма эканамічных пераўтварэнняў, на вачах мільёнаў падманутых людзей адбываецца наменклатурная прыватызацыя народнай маёмасці, калі расце беспрацоўе, роля Свабоднага Прафсаюза Беларусі (СПБ) становіцца асабліва значнаю. Сярод працаўнікоў бытуе яшчэ такая памылковая думка — быццам бы з выхадам з афіцыйнага прафсаюза яны губляюць права на атрыманне выплат па бальнічнаму, пуцёвак і другіх ільгот, прадугледжаных сацыяльным страхаваннем. Хачу падкрэсліць, што усе гэтыя выплаты не залежаць ад членства ў прафсаюзах. Дзяржаўнае страхаванне не з'яўляецца страхаваннем прафсаюзным. Проста ўрад аддаў частку фондаў сацыяльнага страхавання федэрацыі прафсаюзаў. Але гэта не азначае, што ім не могуць карыстацца не члены прафсаюза або члены другіх прафсаюзаў. Сацыяльнае страхаванне распаўсюджваецца на ўсіх работнікаў прадпрыемстваў, установаў. Іншая справа, што для таго, каб захаваць манаполію на прафсаюзны рух, дзяржаўныя прафсаюзы ішлі на парушэнне заканадаўства. Вось таму Свабодны прафсаюз Беларусі і адстойвае сістэму персаніфіцыраванага дзяржаўнага страхавання, гэта калі сацыяльныя сродкі пераводзяцца на асабістыя рахункі членаў прафсаюза і расходуюцца згодна распрацаванага палажэння на мэты, абгавораныя ў гэтым палажэнні.

У наш час прававой неабароненасці працоўных, як ніколі паўстала неабходнасць аб'ядноўвацца менавіта ў Свабодны прафсаюз. Афіцыйны дзяржаўны прафсаюз не можа рэальна ды і не жадае абараняць інтарэсы простага, радавога працаўніка, бо ён, як і раней, абараняе ў першую чаргу інтарэсы адміністрацыі. Дарэчы, у статуце Свабоднага прафсаюза запісана, што ён не дапускае ў сваім членстве работадаўцаў і асоб, якія выконваюць функцыю найма на работу і звальнення. Гэта вельмі правільна і справядліва.

Нядаўна чамусьці да мяне прыязджаў будаўнік з калгаса са скаргай на свайго старшыню. Цяжка сабе ўявіць, што дазваляе сабе гэты феадал у адносінах да працоўных. Што я мог параіць гэтаму запалоханаму чалавеку? Старшыня-прыгоннік можа ўмомант выкінуць з калгаснага жылля, пакінуць без працы, без агарода, пашы . . . Не лепшае становішча і на гарадскіх прадпрыемствах. А ўсё таму, што людзі раз'яднаны. Многія не ведаюць сваіх грамадзянскіх і працоўных правоў.

Рабочыя і калгаснікі, служачыя, інтэлігенцыя, арганізаваўшыся ў Свабодны прафсаюз Беларусі вы зможаце знайсці адказ на многія пытанні. Нагадваю, што Свабодны прафсаюз не залежыць ад органаў дзяржаўнай улады, палітычных і рэлігійных арганізацый, мае права прымаць удзел у фарміраванні органаў дзяржаўнай улады.

Усіх, каго зацікавіць гэтае пытанне, звяртайцеся да мяне за больш падрабязнымі тлумачэннямі наконт стварэння першасных арганізацый Свабоднага прафсаюза Беларусі.

ВІКТАР РАЧКО.
тэл. 2-13-15

Коратка аб усім

30 кастрычніка, напярэдадні Дзядоў, група сяброў і прыхільнікаў БНФ усклала кветкі да помніка паўстанцам 1863 года ва ўрочышчы Ласасін.

✦ ✦ ✦

Гісторыя з маслам і дырэктарам маслазавода яшчэ не скончылася. Нядаўна зноў, у каторы ўжо раз, на раённай сесіі адбылося галасаванне — настойваў на гэтым абласны Савет. Не гэты раз дэпутаты - наменклатуршчыкі сцяной сталі за свайго калегу і не аддалі яго ў рукі правасуддзя. Абласны Савет усё ж такі даў дазвол на прыцягненне Семенчука да адказнасці. Што будзе далей — пажывем — пабачым.

✦ ✦ ✦

Старшыня Савета міністраў Вячаслаў Кебіч на сустрэчы з кіраўнікамі абласцей і раёнаў у Баранавічах сказаў і такое: «Калі яшчэ пару бітваў з Расіяй пад Оршай выйграем, то краны з нафтай будуць перакрыты». Тут намёк на бітву 1514 года, калі гетман Беларуска-літоўскага княства Астрожскі атрымаў бліскучую перамогу над расіянамі. Артыкулы ў друку, мерапрыемствы ў гадавіну гэтай бітвы выклікалі ў прем'ера, як ні дзіўна, не гонар за гераічную нашу мінуўшчыну, а незадавальненне. Болей таго, у гэтым выказванні недарэчная спроба перакласці віну за крызіс з нафтай з хворай галавы на здаровую.

✦ ✦ ✦

Лідэр БНФ «Адраджэнне» Зянон Пазняк, аналізуючы падзеі ў Маскве, зазначыў, што там «людзі пад чырвонымі сцягамі і людзі са свастыкай дзейнічалі заадно». Ён заявіў, што на Беларусі павінна быць прыпынена дзейнасць ПКБ, КПСС, ДСПС, Славянскага Сабора «Белая Русь» і Саюза афіцэраў, бо гэтыя арганізацыі непасрэдна прымалі ўдзел у падрыхтоўцы мяцяжу ў Маскве.

✦ ✦ ✦

Пасля пісьма жыхара Ружан ў «Народную газету» аб махінацыях з прадажай хлебабулачных вырабаў супраць вінаўных з Ружанскага спажывецтва была ўзбуджана крымінальная справа. Але наменклатура ўмее памецьць за сваіх. Так, старшыня пассавета Гайдук З. Е. вырашыла наладзіць сям'і Лісоўскага невыноснае жыццё. У двухкватэрны дом, у якім пражывае Лісоўскі з маці-інвалідам Ярмушчык Я. Б., засяляюць сям'ю Баран, сыны якой не выходзяць з турмаў. Няцяжка здагадацца, якім будзе жыццё ў такім суседстве, бо адну хату гэтая вясёлая сям'я паспела ўжо спаліць.

✦ ✦ ✦

Ці то жарт, ці то праўда, але сапраўды на вуліцы Каліноўскага ёсць лужына заслужаная, аб якой і ў газеце пісалі, і на радыё гаварылі. Асушыць яе ніхто не можа. І вось мы рашылі тут качак ды гусей разводзіць, каб мяса ў горадзе нашым больш было. Можа і паслядоўнікі ў нас знойдуцца, бо такая ж лужына ёсць на стыку вуліц Простай і Леніна.

Жыхары вул. Каліноўскага.

✦ ✦ ✦

У папярэднім нумары нашай газеты мы пісалі пра парушэнні закона пры размеркаванні кватэр у «чарнобыльскім» доме (вуліца Інтэрнацыянальная, 8). Матэрыял перададзены ў раённую пракуратуру. Праінфармавана і абласная пракуратура. Але прайшло амаль два месяцы, а ніякіх звестак адтуль усё яшчэ не паступала.

✦ ✦ ✦

Пружанскі гандаль зноў нас абдурвае. Неатавараныя па яго віне талоны на гарэлку за жнівень-верасень атаварваюцца цяпер, але па новай, высокай цане. Людзі абураюцца, а мясцовая ўлада маўчыць.

✦ ✦ ✦

16 кастрычніка па ініцыятыве БНФ у Менску праведзена канферэнцыя некамуністычных і антыімперскіх сіл рэспублікі. Тут сабраліся прадстаўнікі 36 партый, рухаў, прафсаюзаў і грамадскіх арганізацый.

З дакладам «Да характарыстыкі палітычнага становішча ў краіне» выступіў лідэр БНФ Зянон Пазняк. Ён абгрунтаваў неабходнасць адстаўкі цяперашняга ўрада і замены яго ўрадам кааліцыйным. З дакладамі аб эканамічным становішчы выступілі народны дэпутат Віктар Алампіеў, намеснік старшыні Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі Станіслаў Гусак, намеснік старшыні Сялянскай партыі Беларусі Іван Нікітчанка. Народны дэпутат Уладзімір Заблоцкі прапанаваў структуру кааліцыйнага ўрада і расказаў аб яго задачах. Такім чынам, дэмакратычныя сілы, аб'яднаўшыся, прапануюць сесіі Вярхоўнага Савета рэформу палітычнай улады шляхам стварэння пераходнага кааліцыйнага ўрада, які стане гарантам правядзення выбараў у ВС вясной 1994 года і вываду рэспублікі з эканамічнага крызісу.

✦ ✦ ✦

Сакратар камуністычнай арганізацыі раёна Аляксандр Зубко звярнуўся да старшыні раённага Савета з просьбай прадастаўляць камуністам перыядычна старонку раённай газеты. На паседжанні выканкама просьбу камуністаў падтрымала толькі намеснік старшыні. Большасць жа членаў выканкама выказалася супраць.

Непадгадаў...

Я быў вельмі здзіўлены, убачыўшы сярод прозвішчаў дэлегатаў гэтак званага Кангрэса народаў Беларусі ад Пружаншчыны прозвішча сакратара Саюза моладзі Алеся Бліznюка. Справа ў тым, што ён увесь час сцвярджаў, што Саюз моладзі не займаецца палітыкай. А тут раптам апынуўся сярод самых рэакцыйных пракамуністычных сіл, паехаў гандляваць самым святым для кожнага чалавека — суверэнітэтам сваёй краіны. Як цяпер ужо вядома, удзельнікі гэтага кангрэса маюць самае прамое дачыненне да крывавага мяцяжу ў Расіі. Нездарма ў ганаровым прэзідыуме сядзелі відныя арганізатары гэтага мяцяжу расіяне Бабурын і Стэрлігаў.

Ах, Саша, Саша! Непадгадаў ты! Пачакаў бы яшчэ крыху, а так засвяціўся. Відаць, твае настаўнікі з КПБ - ПКБ - КПСС запэўнілі цябе ў тым, што Ельцын у Расіі, а Шушкевіч у Беларусі ва ўладзе апошнія дні. А можа ўжо і пасаду прапанавалі ў адроджаных партыйных органах? І яшчэ дужа цікава, які народ ты прадстаўляў там і ад каго атрымліваў мандат на ўдзел у гэтым камуністычным зборышчы?

ВІКТАР РАЧКО.

Зварот
да усіх жыхароў г. Пружаны

Паважаныя землякі!

Мы, удзельнікі садаводчага таварыства «Мічурынец», сабраўшыся на свой першы ўстаноўчы сход, заўляем наступнае:

29 чэрвеня г. г. сесія Пружанскага райсавета абсалютнай большасцю дэпутацкіх галасоў прыняла пастанову аб перадачы высокаўрадлівай (звыш 40 балаў) зямлі саду «Плябанцы» пад індывідуальнае будаўніцтва, учыніўшы тым самым супрацьзаконную акцыю па растранжырванню зямлі, прыгоднай для [illegible] мэт («Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі», артыкулы 16, 18 і 19).

Адзначым, што сад спісан, але ж пакуль што цэлы, і хутка кіраўнікі раёна і горада аддадуць каманду на яго знішчэнне, калі мы не зможам прадухіліць гэта злачынства.

Сесія вырашыла лёс унікальнага сада без усякага папярэдняга аналізу, экспромтам, на хаду. Праблема зямлі саду не была нават ўключана ў план работы сесіі, а была ўстаўлена ў павестку дня сесіі па ходу яе работы. Ніякай камісіі па ацэнцы стану сада ніхто не ствараў. Выходзіць, што дэпутаты яўна не былі гатовы ўсебакова абмеркаваць неабходнасць знішчэння саду, таму і прынялі такое фармальнае, безадказнае рашэнне.

Мы лічым надуманымі і безадказнымі заявы высокапастаўленых чыноўнікаў аб тым, што ў граніцах горада [illegible] для забудовы індывідуальных катэджаў. Лёгка ўпэўніцца, што горад акружаны палямі, адведзенымі пад індывідуальнае будаўніцтва, якое не ахапіла нават палову гэтых палёў.

Мы заяўляем, што прадстаўнікі ўлады (Тарасевіч С. В., Трэбнікаў Р. П., Тур У. М., Бурскі В. І., Русы М. І., Апацкі А. і інш.) у перыяд стварэння саду не прымалі ніякага ўдзелу ў гэтай рабоце. Якое ж яны маюць маральнае права распараджацца зямлёй унікальнага саду, як сваёй уласнасцю, прымаць рашэнне на знішчэнне гэтага саду?

У 50-ыя — 60-ыя гады сад спланаваў і вырасціў таленавіты садавод-самародак Голад Рыгор Андрэевіч. Сад і павінен быць адроджаны да жыцця, як помнік яго тварцу і людзям, якія садзілі гэты сад.

Мы звяртаемся да ўсіх простых працаўнікоў, да механізатараў многіх прадпрыемстваў горада: не [illegible] на знішчэнне унікальнага саду і адмаўляйцеся выконваць у садзе якія-небудзь работы, звязаныя з яго знішчэннем! Скажам рашучае «не» кожнаму, хто пасягае на знішчэнне саду.

Зварот прыняты 5 кастрычніка 1993 года на агульным установачым сходзе ўдзельнікаў таварыства (Пратакол № 1)

Школа становіцца беларускамоўнай

Настаўніцкі калектыў школы-гімназіі вялікую ўвагу надае пытанням беларускага нацыянальнага адраджэння. З адкрыццём нашай 5-й школы ў 1990 годзе было вырашана ўсе першыя класы перавесці на беларускую мову навучання. Бацькі з разуменнем аднесліся да гэтага. Напачатку былі цяжкасці з падручнікамі, якіх не хапала.

Цяпер былыя першакласнікі вучацца ў чацвёртых класах. Яны свабодна валодаюць роднай мовай. На беларускай мове вучацца сёння ўсе пачатковыя класы, а іх у нашай школе аж дзевятнаццаць.

Вучні сярэдніх і старэйшых класаў ахвотна вывучаюць гісторыю Беларусі, геаграфію і некаторыя іншыя прадметы на беларускай мове. Акрамя таго, многія з іх дасканаляць веданне роднай мовы на курсах па выбару і факультатывах.

Пазакласная работа ў школе ў асноўным вядзецца на беларускай мове, справаводства — таксама.

Недалёка той час, калі ўся школа стане беларускамоўнай.

ЯЎГЕН ГАЛЯКЕВІЧ.

Ад рэдкалегіі: У нашым раёне засталося 45 школ. З іх сярэдніх—30, 9-гадовых—10, пачатковых —5. У бягучым навучальным годзе ў раёне навучаецца 9910 школьнікаў. Поўнасцю рускамоўнымі застаюцца пакуль што тры школы: № 2 1 3 у г. Пружаны і Параслянская.

Разбурылі і... спісалі

Больш года прайшло, як разбураны будынак былога дзеддома па вуліцы Савецкай. Гэты дом належаў колішняму славутаму пружанскаму доктару Пацэвічу. Па задуме архітэктара Чарняўскага тут мелі намер набудаваць Дом мастацтваў. Відаць, і такі дом патрэбен Пружанам. На сесіі раённага Савета я таксама за гэта галасавала. Але няўжо без разбору трэба ўсе старыя будынкі толькі знішчаць? Хіба нельга іх уключаць у архітэктурны ансамбль горада, як гэта робяць другія людзі? Тым больш, што гэта дом родны для многіх пасляваенных сірат. Звыш разбурэння, як паказвае практыка, амаль заўсёды мае карыслівыя мэты. Што, не верыце? То скажыце, дзе падзеліся выдатныя драўляныя сцены з былога будынка школы № 1? А цяпер давайце паглядзім, дзе дзеўся дом Пацэвіча. Спецыяльна створаная раённым Саветам камісія ўстанавіла, што дом гэты быў перададзены Жыллёва-камунальнай гаспадарцы (ЖКГ). Тыя яго апрыходавалі і спісалі. Прычым апрыходавалі чамусьці толькі сцены і частку цэглы. Астатняе невядома дзе.

Дзе ж падзеліся тыя сцены, зробленыя з выдатнай пушчанскай сасны, якія маглі б стаяць яшчэ каля сотні год? Як сведчаць дакументы ЖКХ, іх спісалі на штахетнік, які зрасходавалі на агароджу дамоў па вул. Свабоды, 38, 46, Шырмы, 46/13, Чырвонаармейскай, 6, Каліноўскага, 21, Чарнышэўскага, 24, Кобрынскай, 37. Яшчэ частка сцен пайшла на дровы, якія выпісаны былі гараджанам, што пражываюць у дамах па вуліцы 8-е сакавіка, 7, Інтэрнацыянальнай, 24, 12, 14, Будаўнічай, 10, Вашкевіча, 6, Кастрычніцкай, 60, Касцюкова, 73.

Скажыце, у якім царстве, у якой дзяржаве ёсць гаспадары, якія выдатны будаўнічы матэрыял пускаюць на штахетнік і дровы? І чаму ўся гэта перадача дома і спісанне праводзіліся без адпаведнай камісіі гарсавета? І яшчэ адно. Ніякай новай агароджы каля дома № 21 па вул. Каліноўскага ніхто не ставіў, хоць акт-спісанне сведчыць, што штахетнік са сцен былога дзеддома і сюды пайшоў.

ГАЛІНА ЧАРКАСАВА,
дэпутат раённага Савета.

Давайце глядзець далей уласнага носа

Усё глыбей пазнаем мы цану славеснай дэмагогіі нашых былых камуністычных лідэраў і сёняшніх наменклатуршчыкаў-«дабрадзеяў», якія прабраліся ў народныя дэпутаты. Прыкрываючыся гэтай дэмагогіяй, як дымавой заслонай, яны стварылі і вынесцілі сістэму беспрэцэдэнтнага абкрадання працоўнага народа.

Гэта ж яны ператварылі нашы невялікія працоўныя зберажэнні ў «дзіркі ад абаранкаў». Лопнулі, як мыльныя бурбалкі, довады і запэўніванні нашых ашчадных кас у тым, што вельмі «выгадна, надзейна і зручна» захоўваць працоўныя зберажэнні менавіта ў іх сейфах. Атрымалася ж як у тым даўнім жарце-прымаўцы: «банк лопнуў і ніхто грошай не атрымае». «Лопнулі» ў нашай пружанскай ашчаднай касе і мае тры тысячы рублёў, якія я гадамі збіраў на неадкладныя патрэбы.

Дык ці ж толькі там адны мае зберажэнні «лопнулі»?

Але якім чынам усё ж такі зніклі нашы зберажэнні?

Пераканаўчы адказ на гэта пытанне дае гара валюты, знойдзеная у асабістым сейфе народнага дэпутата Вярхоўнага Савета Арціменi Д. К., гэтага «уважлівага і чуллівага чалавека, які карыстаўся вялікім аўтарытэтам і павагай ва ўсіх», такога «чэснага, шчырага і прыстойнага чалавека» (з некролагаў ! ! !).

Зараз ужо многім ясна, што нашы зберажэнні шляхам хітрамудрых папяровых камбінацый ператварыліся ў надзейную іншаземную валюту і перакачвалі ў кішэні высокапастаўленых злодзеяў і жулікаў. Такіх, як той жа Арціменя Д. К., нядаўна застрэлены сваімі ж сабутэльнікамі па мафіі.

А колькі яшчэ такіх «Арціменяў» сёння пры ўладзе!

Землякі-пружанцы! Давайце глядзець далей уласнага носа і смялей даваць справядлівыя ацэнкі ўсім, хто прэтэндуе на званне народнага дэпутата.

І. ХАДЗЯЕЎ

Слова звычайнага члена прафсаюза да свайго старшыні

Сёння ўсім вядома ваша палітычная пазіцыя, шаноўны старшыня райкома прафсаюзаў работнікаў адукацыі т. Зубко. Узначаліўшы яшчэ і камуністычную арганізацыю, Вы апынуліся на двух крэслах. І замест таго, каб абараняць інтарэсы настаўнікаў, вы кінуліся «на защиту» Хасбулатава, Руцкога і іх хаўруснікаў — людзей суседняй дзяржавы. Пацвярджаюць гэта два «Заявления Пружанского РК ПКБ», надрукаваныя ў раённай газеце. У апошняй заяве—старая напышліва-бальшавіцкая фразеалогія тыпу «обращаем внимание . . . на недопустимость . . .» Можа ўжо нарэшце хопіць «обращать» і «недопускать», тлуміць галовы настаўнікам і людзям падобнай дэмагогіяй?

Лепш сваю энергію скіруйце на карысць работнікаў адукацыі.

М. ВОЛКАЎ.

Каго абараняе прафсаюз?

Вядома, што прафсаюзы павінны абараняць інтарэсы работнікаў перад работадаўцамі. Так заведзена ва ўсіх дзяржавах свету, акрамя тых, дзе кіравалі ці кіруюць камуністы. Яны ператварылі прафсаюзы ў сваю паслухмяную зброю, у свае «прывадныя рамяні».

Чые інтарэсы можа выражаць і абараняць прафсаюз работнікаў адукацыі, калі ў складзе яго раённага камітэту з 27 чалавек — 15 дырэктараў і іх намеснікаў на чале з загадчыкам РАНА? А сярод 9 членаў прэзідыума райкома прафсаюза практычна ўсе— работадаўцы.

Не дзіўна таму, што у СШ № 3 мясцовы камітэт прафсаюза два гады спрабаваў заключыць з дырэктарам пагадненне па правядзенню мерапрыемстваў па ахове працы, але і па сёння беспаспяхова.

АЛЯКСАНДР ЖАРКОЎ,
настаўнік СШ № 3.

Шчырасць з нахабствам

Тыднёвік «Феміда» надрукаваў гутарку з паслом Расіі ў Беларусі Сапрыкіным «Русский к русскому пришел». Шчырасць у ім мяжуе з чыста маскоўскім нахабствам, прычым на ўзроўні «мне нравится—мне не нравится». Паслу не падабаецца, што беларусы святкуюць Дзень вайсковай славы 8 верасня. Затое падабаецца вось гэта: «сначала сделают люди, а потом белорусы». Гэта пра рынычныя адносіны і так зняважліва пра нас, беларусаў. Вось яшчэ адно прызнанне: «Россия тоже заинтересована в том, чтобы не потерять Беларусь, как . . . «окно в Европу». І яшчэ: «Мы не возьмем на иждевение ни Беларусь, ни какую то другую рэспубліку». Прыслухайцеся, беларусы, што пра нас гавораць. Няўжо ў якой іншай еўрапейскай дзяржаве пасол дазволіў бы сабе падобныя выказванні пра гаспадароў?

Зварот
да дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Саветы ўсіх узроўняў ад пачатку зачынавання іх камуністычным рэжымам уяўлялі сабою тэатральную шырму, распісаную лозунгамі аб дэмакратыі і раўнапраўі. Ад дэпутатаў патрабавалася беззаганнае выкананне толькі адной ролі: аднадушнай падтрымкі і адабрэння рашэнняў кіруючай камуністычнай партыі. З-за гэтай прычыны саветы яшчэ ў зародку склаліся як аморфная, адарваная ад патрэб жыцця структура.

Пасля жніўня 1991 года ВС Рэспублікі Беларусь скасаваў шосты артыкул Канстытуцыі і ўзяў на сябе ўсю паўнату ўлады. Аднак з цягам часу ўсё больш рабілася відавочным, што саветы, створаныя зусім для іншай мэты, з новымі функцыямі прафесійнага кіравання яўна не спраўляюцца. Адсутнасць фінансавай палітыкі, прамаруджванне з прыняццем заканадаўчых актаў для правядзення кардынальных эканамічных рэформаў, бездапаможнасць урада прывялі Беларусь да беззані. Савет міністраў стаў ператварацца ў партбюро з аддзеламі і пададдзеламі на чале са старымі партыйнымі кадрамі, з кумаўством і адпрацаванай сістэмай размеркавання сваім людзям. Гаспадарнікі зноў трапілі ў залежнасць, але на гэты раз ад выканаўчай улады.

Так працягвацца далей не можа. Вярхоўны Савет нарэшце павінен усвядоміць сваю грамадзянскую адказнасць перад адной для ўсіх нас Бацькаўшчынай. Настаў час неадкладна вырашаць на рэформу заканадаўчых і выканаўчых органаў улады, каб яны былі здольнымі несці нялёгкую ношу кіравання самастойнай дзяржавай Беларусь.

Мы звяртаемся да Вас, шаноўныя дэпутаты, і патрабуем:

1) прыняць на гэтай сесіі новы выбарчы Закон і назначыць выбары ў прафесійны парламент не пазней сакавіка 1994 года.

2) распусціць недзеяздольны пракамуністычны Савет міністраў і стварыць кааліцыйны ўрад народнага даверу.

Па даручэнню сходу сяброў БНФ старшыня Пружанскай Рады:
Г. САРОКА

Ад арганізацыі сялянскай партыі:
І. ХАДЗЯЕЎ

Ад ТБМ імя Ф. Скарыны:
І. ЗДАНОВІЧ

Ад фонду дэмакратычных рэформ імя Сапегі.
Г. ЧАРКАСАВА

г. Пружаны
3 лістапада 1993 г.

Зноў пра цэны

У канцы кастрычніка газеты надрукавалі неафіцыйнае паведамленне, што ўрад падпісаў пастанову аб павышэнні ўдвая цэн з 1 лістапада на хлеб і малако. Але трывогі людзей і чэргі ў крамах аказаліся дарэмнымі. Сваю пастанову ўрад прытрымаў. Але ці надоўга?

К О Л Ь К І Н А С?

На 1 кастрычніка насельніцтва Беларусі склала 10,4 млн. чалавек.

Паважаныя чытачы, ахвяраванні на выданне чарговага нумару газеты «Пружанскае веча» можна пералічваць на рахунак ТБМ імя Ф. Скарыны № 000700920 у Пружанскім Белаграпрамбанку.

Заснавальнікі: Пружанская рада Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне». Раённая рада Таварыства Беларускай Мовы. Сябры Сялянскай партыі. Сябры Фонду «Льва Сапегі

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў.

Рэдкалегія: Жытко К. тэл. 2-33-51
Здановіч І. — 2-23-23
Рачко В. — 2-13-15
Хадзяеў І. — 2-23-97
Чаркасава Г. — 2-33-51

БЯСПЛАТНА

Пружанская гарадская друкарня 1857—999/9.11.93.